испытуемых, что указывает на внутреннюю открытость, рост и возможность двигаться в связи с запросами и предложениями внешнего мира. Высокий показатель выявлен у 23,53% испытуемых. Это свидетельствует об открытости, восприимчивости, решительности, готовности к действиям, но также о строгих предъявляемых к себе требованиях.

Таким образом, в ходе исследования установлено, что небольшой процент испытуемых имеет высокий показатель по шкалам «экзистенциальность» и «исполненность». Это свидетельствует о том, что сравнительно небольшое количество современных студентов удовлетворены своей жизнью и ощущают благополучие. Перспективами дальнейшего исследования в данном направлении являются изучение половых особенностей экзистенциальной исполненности в юношеском возрасте.

**Литература**


1. Лэнгле, А. Жизнь, наполненная смыслом. Логотерапия как средство оказания помощи в жизни / А. Лэнгле. — М. : Генезис, 2003. — 120 с.
2. Корякина, Ю. М. Условия исполненной жизни: описание и измерение экзистенциальных мотиваций / Ю. М. Корякина // Национальный психологический журнал. — 2015. — № 4 (20). — С. 49–65.
3. Майнина, И. Н. Адаптация Шкалы экзистенции А. Лэнгле, К. Орглер к русскоязычной выборке : дипломная работа. — М. : МГУ. — 2007.
4. Кривцова, С. В. Шкала экзистенции (Existenzskala) А. Лэнгле, К. Орглер / С. В. Кривцова. — Москва, 2009. — № 1. — С. 141–170.


## Дэкаланізацыя мапы ў паэме Эдрыен Рыч «Атлас складанага свету»


*Субат Я. Ю., студ. V к. БДУ,*
*навук. кір. Бутырчык Г. М., канд. філ. навук, дац.*


Адным з найбольш выбітных спосабаў крытычнага аналізу рэчаіснасці ў посткаланіяльнай літаратуры з’яўляецца стратэгія рэвізіі (перагляду альбо пераасэнсавання), скіраваная на аналіз механізмаў прыгнечання маргіналізаваных супольнасцей у мастацкім тэксце. Канадскі літаратуразнаўца С. Слеман адзначае адмысловую трансфармацыйную сілу рэвізіі, яе здольнасць перабудоўваць і рэканструяваць посткаланіяльную рэчаіснасць сродкамі прыгожага пісьменства [3]. Асобным выпадкам посткаланіяльнай рэвізіі прапануецца разглядаць «дэкаланізацыю мапы»: перагляд топасу геаграфічнай карты ў мастацкай літаратуры. Акрэсліваючы спецыфіку гэтай практыкі, Г. Хаган сведчыць, што частае выкарыстанне топасу мапы ў сучасных посткаланіяльных тэкстах непасрэдна звязана з пераасэнсаваннем гісторыі еўрапейскага каланіялізму:

«Захапленне посткаланіяльных пісьменнікаў <…> топасам мапы можна разглядаць як канкрэтны прыклад мастацкай рэвізіі, у якім дэсістэматызацыя вузка акрэсленай і абмежаванай “картаграфічнай” прасторы дазваляе культурна і гістарычна абгрунтаваць крытыку каланіяльнага дыскурсу, адначасова ствараючы імпульс для апісання і даследавання “новых тэрыторый”, што былі забаронены альбо ігнараваліся дамінуючымі дыскурсамі» [Пераклад з англійскай тут і далей мой. — *Я. С.*] [1, p. 410].

Дэкаланізацыя мапы — асноўны прыём паэмы «Атлас складанага свету» амерыканскай паэткі і грамадскай актывісткі Эдрыен Рыч. Як бачна з назвы, менавіта геаграфічная карта Злучаных Штатаў з’яўляецца аб’ектам, які арганізуе вакол сябе тэкст. Топас «Атласа» спалучае ў сабе як рэальныя, так і выдуманыя месцы, пры гэтым асаблівую ўвагу Эдрыен надае выбару апошніх. Згодна са стратэгіяй рэвізіі, паэтка наўмысна не абірае тыя кропкі на мапе, сімвалічнасць якіх трывала замацавана ў калектыўнай свядомасці. У разуменні Э. Рыч, такія месцы маюць значэнне выключна для дамінуючых у грамадстве груп, і таму з’яўляюцца заведама непрыдатнымі для паўнавартаснага разумення вобраза краіны. Замест іх у «Атлас» уключана тое, што адлюстроўвае непрывабныя старонкі амерыканскай гісторыі — у першую чаргу прыгнёт нацыянальных і расавых меншасцей: «Catch if you can your country’s moment, begin / where any calendar’s ripped-off: Appomattox / Wounded Knee, Los Alamos, Selma, the last airlift from Saigon / the ex-Army nurse hitch-hiking from the debriefing center; medal / of spit on the veteran’s shoulder / — catch if you can this unbound land these states without a cause / earth of despoiled graves and grazing these embittered brooks / these pilgrim ants pouring out from the bronze eyes, ears, / nostrils, / the mouth of Liberty [2, p. 148] — Злаві, калі зможаш, момант сваёй краіны, пачні / там, дзе абрываюць кожны каляндар: Апаматакс / Вундэд-Ні, Лос Аламас, Сэльма, апошняя перакідка з Сайгона / былая ваенная медсястра едзе з цэнтра аўтастопам / медаль / пляўка на плячы ветэрана / — Злаві, калі зможаш, гэтую нястрыманую зямлю, гэтыя штаты без карысці / зямлю разрабаваных магіл і пашу азлобленых ручаёў / гэтых мурашак-пілігрымаў, што выліваюцца з бронзавых вачэй, вушэй, ноздраў, / рота Свабоды».

Эдрыен Рыч паслядоўна дэміфалагізуе паўночна-амерыканскі краявід, спалучае гераізаваныя вобразы з непрывабнай рэчаіснасцю. Асабліва паказальным у гэтым кантэксце становіцца вобраз статуі Свабоды, што стала жыллём мурашоў-пілігрымаў, якія адсылаюць чытача да «pilgrim fathers» — айцоў-пілігрымаў, першых пасяленцаў Паўночнай Амерыкі. Гісторыя пілігрымаў глыбока пранізвае культуру Злучаных Штатаў — Мэйфлаўэр, Плімут, Дзень падзякі і інш. сталі аднымі з традыцыйных сімвалаў краіны. Параўнанне англійскіх пасяленцаў з мурашамі адпавядае посткаланіяльнаму разуменню іх ролі ў гісторыі кантынента як іншаземных захопнікаў, якія

злачынствамі і гвалтам атрымалі ўладу на тэрыторыі Амерыкі, адабраўшы ў карэннага насельніцтва іх зямлю і свабоду. Дэкаланізацыя мапы Злучаных Штатаў Амерыкі ў паэме, такім чынам, адбываецца як за кошт пераасэнсоўвання значэння ўстойлівых сімвалаў, так і шляхам наўмыснага нанясення на геаграфічную карту краіны месцаў, непасрэдна звязаных з гісторыяй прыгнёту асобных супольнасцей — вобразнасць «Атласа» становіцца такой жа разнастайнай і супярэчлівай, як і сучасны вобраз посткаланіяльнага грамадства.

**Літаратура**

1. Huggan, G. Decolonizing the Map. / G. Huggan // The Post-Colonial Studies Reader / edited by B. Ashcroft, G. Griffiths and H. Tiffin. — London : Routledge, 1995. — 526 p.

2. Rich, A. C. Adrienne Rich's poetry and prose: poems, prose, reviews, and criticism / selected and edited by Barbara Charlesworth Gelpi, Albert Gelpi / A. C. Rich. — New York : W. W. Norton & Co, Inc., 1993. — 433 p.

3. Slemon, S. Post-Colonial Allegory and the Transformation of History [Electronic resource]. — Mode of access: https://journals.sagepub.com/doi/10.1177/002198948802300115. — Date of access: 13.11.2021.

## Уникальный авторский стиль в масляной живописи 1990–2010-х гг. китайского художника Лен Цзюня

*У Сянь, асп. III к. БГУ,*
*науч. рук. Шунейко Е. Ф., канд. искусствов., доц.*

**Аннотация:** *актуальность работы заключается в определении новых возможностей современной китайской живописи маслом конца 1990–2010-х гг. На примере творчества выдающегося живописца Лен Цзюня дается характеристика таких идейно-образных направленностей, как метафорический катастрофизм и гармонизация реальности. Цель работы — выявить на конкретных произведениях творческую эволюцию художника, который в 2000–2010-х гг. отдает предпочтение связям современной живописи с традициями великих художественных стилей прошлого. Проведен необходимый анализ работ художника разных периодов, в особенности, идеальных женских портретов, которые производят неизгладимое эстетическое впечатление на зрителей.*

В заключительных выводах приводятся аргументированные утверждения, что в современной живописи есть большие перспективы неисчерпаемых связей традиции и новаторства.